**Асобны № каштуя усюды 50 кап.**

***Працоуны народ усіх краеу—злуйчася!***

# ДЗЯННІЦА

**Вестка Беларускаго Нацыянальнага Камісарыяту і Маскоускай Беларускай Сэкцыі Р. К. П. (бальшэвікоу).**

| КОШТ ГАЗЭТЫ. | | |
|---|---|---|
| | У РАСЕІ. | ЗА ГРАНІЦУ. |
| 1 м. | 1 р. 80 к. | 3 р. — к. |
| 2 м. | 3 р. — к. | 4 р. — к. |
| 3 м. | 4 р. 25 к. | 6 р. — к. |
| 4 м. | 6 р. — к. | 8 р. 70 к. |
| 6 м. | 8 р. 50 к. | 12 р — к. |
| 9 м. | 13 р. 50 к. | 18 р. — к. |
| 12 м. | 17 р. — к. | 20 р. — к. |

Перамена адрысу 50 к.

Выпісваючым некулькі экз.—робіцца скідка 20%.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Гранатны пер., 24 Тел. 2-98-77.

Рукапісы, якія прысылаюцца у радакцыю ля друку, павінны быць напісаны разборна і на адным боку паперы.

Ня прынятыя рукапісы ля друку звяртаюцца аутарам назад, калі ля пярасылкі іх прыслана марка, як не-та зніштажаюцца. Радакцыя пакідая сабе правы папрауляць рукапісы.

Радакцыя адчыняна ад 11 да 4 г. У гэты часы прымая і радактар.

**№ 1 (45).**

Масква, 1919 г. 4 Января. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. II год выданьня

## Канцылярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

### ОЧЕРЕДНЫЕ ЗАСЕДАНИЯ

**Комитета Московской Белорусской Секции Российской Коммунистической Партии (большевиков)**

установлены еженедельно по субботам, в 6 часов вечера.

В помещении Издательского Отдела Белорусского Национального Комиссариата (Гранатный пер., 24) производится прием членов белоруссов-коммунистов в Московскую Белорусскую Секцию Р. К. П. (большевиков).

### ОБ'ЯВЛЕНИЕ.

Культурно-Просветительный Отдел Белорусского Национального Комиссариата об'являет, что при Единой Трудовой 97 Советской Школе для детей беженцев из Белоруссии в Москве открыто общежитие с пансионом (Остоженка, д. № 3/14, кв. 17-18).

Желающих просят зарегистрироваться в Культурно-Просветительном Отделе Белорусского Национального Комиссариата. (Гранатный п., 24).

Чародныя агульныя сходбішча Маскоускай Беларускай Сэкціі Р. К. П. (бальшавікоу) адбываюцца што тыдзань у нядзелю а 11 гадзіня раніцы у памяшканні Белнакома (Гранатны, 24). На сходбішчы запрашаюцца усе т.т. беларусы-камуністы і спагадаючыя ім.

У тыя з нядзель, калі робяцца мітынгі, члены Белар. Сэкцыі павінны прыходзіць усе на мітынгі.

**Камітэт Бел. Сэкцыі Камуністау.**

Нужны лица, могущие преподавать в школах 2-ой ступени в уездах Могилевской губернии. Желающих просят зарегистрироваться в Культурно-Просветительном Отделе Белорусского Национального Комиссариата (Малая Никитская, Гранатный пер., д. № 24).

### ПРЕДУПРЕЖДЕНИЕ.

В виду того, что под именем белорусских-коммунистов в последнее время стараются проникнуть в оккупированную Белорусь и на фронты в качестве агитаторов лица, ничего общего не имеющие с Белорусскими Секциями Р. К. П. (большевиковъ), Комитет Московской Белорусской Секции Р. К. П. (большевиков) заявляет, что он ничего общего с подобными лицами не имеет и просит все партийные и государственные учреждения всегда обращать внимание на пред'являемые ими документы.

Посылаемые Московской Белорусской Секцией Р. К. П. (большевиков) тов. для работы в оккупированных местах и на фронтах проходят через Ц. К. Партии и снабжены удостоверениями на бланках с печатью Московской Белорусской секции Р. К. П. (большевиков).

**Московский Комитет Белорусской Секции Р. К. П.**

**Белорусским Отделом** при Комиссариате по делам Национальностей Союза Коммун Северной Области **с 20 октября с. г. открыта в г. Петрограде Белорусская Школа первой и второй ступени (гимназия).** В школу принимаются дети всех белоруссов, постоянно или временно проживающих в Петрограде и его окрестностях; и вообще все желающие.

Прием и запись учащихся продолжится до половины января 1919 года.

Школа помещается: **на Проспекте 25-го октября (бывший Невский), дом 68, кв. 9.**

Подробные справки—в Канцелярии Школы.

### ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ

**членов Московской Белорусской Секции Российской Коммунистической Партии (большевиков)**

состоится 5-го января 1919 года, в 11 часов утра, в помещении Белорусского Национального Комиссариата, Гранатный пер., 24.

## Резолюция общего собрания белоруссов

**29/XII о положении Белоруссии.**

Обсудив вопрос о современном положении Белоруссии, собрание Белоруссов-коммунистов и им сочувствующих, состоявшееся в количестве 400 человек 29 декабря с. г. в помещении кинематографа „Кино-Арс", постановило:

1) Сложное и ответственное пред Революцией международное и внутреннее положение Белоруссии властно диктует скорейшее создание крепкой Советской Белоруссии для того, чтобы можно было с успехом защищать ее, как форпост социальной Революции, на который в первую голову станет обрушаться международный хищный империализм;

2) Только Белорусской Советской власти в условиях данного момента удастся разрешить успешно задачу полного возрождения Белорусского народа;

3) Лозунг „Белоруссы, домой", иначе мобилизация Белорусских коммунистических сил и стоящих за Советскую власть единственно обезпечит молодую Белорусскую Советскую власть потребным запасом подготовленных работников и строителей коммунистического порядка, которые сразу же сделают прочным новый Революционный социалистический порядок.

Принимая во внимание все вышеизложенное, митинг считает необходимым заявить, что только немедленное создание Советской Белоруссии положит прочное основание народной власти на Белоруссии, придаст силу и мощь Белорусской демократии, поднимет ее на борьбу за власть Советов против надвигающегося империализма.

Общее собрание Белоруссов шлет горячий привет великому вождю всемирной революции тов. Ленину и др. борцам за торжество интернационала в твердой надежде, что их усилиями при поддержке трудящихся масс Советская Белорусь станет независимой Советской Рабоче-Крестьянской Республикой. Присоединяясь к постановлению первой конференции Белорусских секций Р. К. П. (большевиков) настоящее собрание призывает всех Белоруссов вернуться на Белоруссию. „Да хаты! Да хаты".

*Масква, 4 января.*

З новым годам, браты-беларусы! З новым шчасьцям!

Скончыуся багаты важкімі здарэннямі 1918 год. Моцны сьлед пакінуу іон у душы беларускаго народу і доуга будзя жыць памяць аб ім. Пачатак яго застау нашую бацькаушчыну разадранай на кавалкі і бяздыханна распрасьціортай пад нагамі варожых многамільіонных арміяу. Адна часьць народу нашаго стагнала пад цяжкаю лятою заваяцяля, другая марнела у выгнанні, а рэшту сядзела па сваіх куткох ды пудліва чакала заутрашняго дня. Абязсіляушая Расея, стомляная чатырохгадоваю братабойнаю вайною, ня мела моцы сапраціуляцца нямецкім захопнікам, і з прагавітасьцяй галоднаго зьвера яны накінуліся на нашую бацькаушчыну. Лінія акупацыі пяраняслася даліока на усход, і немаль уся Беларусь апынулася у кіпцях нямецкаго імпэрыалізму.

У сумежнуй Расейскуй Радавуй Распубліцы працоуны народ, збавіушыся ад панавання кровасмокау-капіталістау, будавау вялікі кгмах новаго вольнаго жыцця, нішчучы усе пяраішкоды на дарозя да свайго шчасьця. А у нас?.. У стомлянум вайною, у зруйнованум і аграблянум краі гаспадарыла прагавітая рука нямецкіх разбойнікау. Мяйсцовая буржуазея, панкі і палупанкі, акрыяушыя пад аховаю нямецкіх багнэтау, дапамагалі немцам у руйнаванні роднаго краю, дапамагалі душыць беларускіх сялян. Той пуд і жах, што наводзіу на іх пабедны ход Расейскае сацыальнае равалюцыі, яны вымяшчалі на нашых сялянах і зорка сачылі, каб яны ня заразіліся „большэвіцкім духам".

Ня задавальняючыся уціскам і прыгняценням працоунаго народу, буржуазея глумілася з яго душы, з яго чалавечаго „я". З надмернай бязсорамнасьцяй яна абвяшчала на увесь сьвет, што беларускаму народу дужа добра жывецца пад апекаю паноу, што іон ня хочя мець нічога супольнаго з „большэвіцкім барбарынствам", што іон хоча жыць аддзельна ад Расеі. Тварылася грубая сфальшавання народнае волі, і „Рада Беларускае Народнае Рэспублікі"—гэтая раджоная дзіця буржуазеі—рассылала усюды свае далягацыі і тэляграммы, кланялася усім каранованым і някаранованым разбойнікам, пачынаючы ад Вільгэльма і канчаючы Вільсонам, каб яны дапамаглі адарваць працоуны народ Беларусі ад працоунаго народу Расеі, каб тым лягчэй было абдзіраць і душыць яго...

Беларускі нябасхіл увесь быу схаваны у туманох і ціомных хмарах. Здавалася, што ніколі ня будзя прасьвету, што ніколі ня убачым мы слонца. Але надыйшла бура з грымотамі і разагнала хмары. Нямецкая равалюцыя адабрала ад беларускай буржуазеі яе найглаунейшую апору—багнэты нямецкіх салдат. Пакінутая на свае уласныя сілы, буржуазея ня змагла пярашкодзіць беларускаму працоунаму народу злучыцца з працоуным народам Расейскае Радавае Распублікі. У Мінску—сэрцы Беларусі—ужо павяваяцца чырвоны штандар Радавае уласьці. Контр-раваліоцыйная нечысьць паущякала, альбо пудліва пахавалася па ціомных куткох. Ізноу засьвяціла слонца вольнасці беларусскаму працоунаму народу.

Браты-беларусы!

Вы цяпер гаспадары свайго шчасьця, свае долі. Нага у ногу з працоуным народам усіх нацыу Расейскае Радавае Распублікі будуйця сваю буду[illegible]ну. Як адзін чалавек устаньця проціу усіх пробау зварнуць стары [illegible] лад. Няхай Новы Год [illegible] удзя станя новым [illegible] кам-новаго, вольнаго [illegible] жыцця.

З новым годам, з новым [illegible]цям!

## Першая канфярэнцыя беларускіх сэкцый Р. К. П. (бальшавікоу).

21-го дзекабра атчынілася у Москве першая канфярэнцыя Беларускіх сэкцый Р. К. П. (большавікоу), якая скончылася толькі 23-го познаю ноччу. Тры дні працы, гарачай, бессуннай! Трэба па справядлівасці сказаць, што канфярэнцыя выдалася на-дзіва удалая, як па саставу далягатау, так і па карыснасці працы, зробляпуй канфярэнцыяю. Год пралетарскае равалюцыі ня прапау дзеля нашае беларускае селянскае маладзі і работнікау: далягаты, як адзін, аказаліся усе атказнымі працаунікамі, як партыі, так і рожных савецкіх установ, свядомыя і моцныя камуністы, разам с тым жадаючыя будаваць Савецкую Беларусь. Толькі гэтаю асабістасьцю саставу дэлягатау і можна тлумачыць, што за тры дні так шмат зробляна. Уражэння, якоя пакінула аб сабе канфярэнцыя, будзя ня скора забыта, бо ня магло ня цешыць сэрца камуніста-беларуса тоя, што у Тамбова уся адказная праца вядзецца беларусамі, што калі там было белагвардзейская узбурэння, беларускія камуніст'кія сілы абаранілі інтарэсы Савецкае уласці. Або тоя, што у якой-небудзь маленькуй Лебедзяні маяцца столькі беларусау-камуністау, што на адзін пау'дзевы чырвоны фронт яны пасылаюць шэсць чалавек моцных сталых працаунікоу!.. Ад усяго уражэння родзіцца моцная вера, што калі соткі такіх работнікау выйдуць дзеля будовы Савецкае уласці на Беларусь, справа беларуская будзя у моцных руках, бо і вытрыманая камуніст'кая праца, ня такая як была у большасьці на Беларусі (Вітабская, Магілеуская і Смаленская губэрні) раней, і, што найважнейшая—(у карысць самой камуніст'кай працы)—праца будовы новаго парадку будзя весьціся сваімі ж беларусамі, якія лепш ведаюць усе варункі мейсцовыя, псыхіку свайго народу, яго мову і тым лепш і з большымі рэзультатамі надойдуць да беларуса працау'ніка і селяніна, якія цяжкім гістарычным праканапням прыйшлі да погляду ня верыць чужынцам, бо апошнія заусюды у краі з'яуляліся панаваць, кіраваць, гаспадарыць, карыстаць беларусамі толькі як працоунымі сіламі. І што у гэтум мы, беларусы-камуністы ня мыляямся, пакажа будучына.

На канфярэнцыю з'ехаліся прэдстаунікі беларускіх камуніст'кіх сэкцый з Пецярбурху, Саратаву, Тамбову, Мінску, Пэвэла і інш. мест.

Сход адчыніу тав. Жылуновіч, які ад імяні Камітэту Маскоускай Беларускай сэкцыі Р. К. П. (большавікоу) як Арганізацыйнаго Бюро па созву канфярэнцыі, прывітау далягатау, жадаючы карыснай працы і падкрэсліваючы сучасны гістарычны і атказны момэнт для Беларусі. Затым былі аглашаны прывітныя тэляграммы і канфярэнцыя перайшла да выбарау прэзыдыуму. Старшынёю канфярэнцыі быу выбран Зм. Жылуновіч, яго

[illegible]варышам. Ал. Усціловіч, сэкратарамі ж [illegible] Блізнюк і Зм. Чэрнушэвіч.

На прэдлажэнню таварышоу — дэлягатау было пастаноулена тэлеграфна прывітаць В. Ц. І. К. і Вышэйшы Ваенна-[р]эвалюцыйны Савет, а так сама тав. Ле[н]іна і Сталіна (тэкст тэлеграм гл. асобна [у] газэця). Зацьвярдзіу'шы парадак дню [і] праграму) канфярэнцыі і кароткі [рэ]глямент, Канфярэнцыя заслухала інфармацыю Камітэту Маскоускай Беларускай [сэкцы]ы, каторуй прышлося узяць на сябе [ін]цыатыву па созву канфярэнцыі і усю [ат]казную працу на самай пастаноупа [не]катарых пытанняу. Былі заслуханы затым інфармацыі дэлягатау з мест, якія [па]казалі наскольки горача беларусы каму[ні]сты узяліся за будову сэкцый, лічачы [в]ельмі атказным сучасны момэнт дзеля Беларусі.

Вельмі доуга і удумна атняслася канфярэнцыя к націянальнаму пытанню на Беларусі, сучаснаму паміжнародпаму становішчу Беларусі, к адносінам паміж палітычнымі партыямі і к пытанню аб збу[дав]анню мейсцоваго беларускаго работ[н]іцка-селянскаго правітяльства. Пасля гарачых прамоу, дэтальных абгаворау усіх гэтых важных пытанняу, канфярэнцыя прыйшла да рашэння, што паміжнародная становішча Беларусі, засілля саціял-згодніцкаго уплыву на працоуныя масы Беларусі і слабасць камуніст'кіх сіл у краю—усіо гэта і шмат іншых варункау [затры]муюць збудову беларускае работніцка-селянскае уласці, каб можна было са [усёю] патрэбнаю моцаю падняць сілы Беларусі да будовы моцнаго Савецкаго ураду, да глыбокаго равалюцыйнаго здвігу беларускіх селянскіх мас, дагэтуль яшчэ [illegible], глыбока [illegible] рускаю сацыяльнаю рэвалюцыяй,—каб можна было, пад канец, [illegible] Беларусь к таму момэнту, калі на [illegible] Расейскае Сацыялі[стычнае] Рэвалюцыі, абрушацца усе ва[illegible] міжнароднаго імпэрыялізму [і] капіталу. Сазнання асабістасці момэнту, [в]ажнасці яго у долі Беларусі раздзелялася усімі дэлягатамі і разалюцыя у гэ[тым] сэнсе была вынясена аднагалосна усімі.

Затым канфярэнцыя перайшла да перагляду усіх пытанняу, звязанных з працою на Беларусі. Было выбрана Цэнтральная Бюро беларускіх сэкцый Р. К. П. з 5 чалавек, каторому і даручана аб'еднаць усю працу сэкцый, находзячыхся у Савецкуй Расеі. Бюро павінна знаходзіцца у [illegible], дзеля таго, каб разам з кіра[уніцтвам] працаю сэкцый [illegible] [illegible] інстытуцыямі [illegible] і савецкаго ураду. Заслухаушы [даклад] тав. Чэрнушэвіча як заместціцеля камісара, аб становішчу Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту і даклады [бы]ушых атказных работнікау Камісарыяту, тав. Усціловіча і Чэрвякова, Канфярэнцыя пастанавіла даручыць Ц. Б. Белар. камуніст'кіх сэкцый разам с Маскоускай сэкцыяй зрабіць патрэбныя змены у арганізацыі і працы Камісарыяту; пры гэтым на места камісара быу выбран Змітро Жылуновіч, стары працаунік Камісарыяту (ад яго начатку) і партыі, а яго таварышам І. Мазур; загадчыкам агітацыонна-[пали]тычнаго аддзелу Камісарыяту быу выбран тав. Тамаш Балбека. Канфярэнцыя, лічачыся с патрэбаю выдання партыйнае газэты, даручыла парыхтаваць [д]а выдання Ц. Б. с тым, каб назва газэты была — «Беларуская праудa». Ра[дакцый]ная калегія павінна быць выдзялена Ц. Б. Канфярэнцыя доуга застанавілася ка пытаннях агітацыйна палітычным і арганізацыйнае працы беларусаукамуністау на Беларусі, і вынясла некулькі разалюцыяу па важнейшым пытанням.

Так, выходзячы з нязвычайнай атказнасці момэнту дзеля Беларусі, па якую абрушыцца уся моц ворагау заходняго імпэрыялізму Англіі, Хранціі и Амерыкі, канфярэнцыя аднагалосна пастанавіла прыступіць к стварэнню беларускіх палкоу чырвонае арміі, с тым, каб актыуна бароцца за інтарэсы камунізму на Беларусі. У другіх разалюцыях Канфярэнцыя выказалася за шырокую працу культурна-асветную і па будоулі сельска-гаспадарскіх камунау. Разам с тым Канфярэнцыяю выказана вера у тоя, што расейскі савецкі урад і Ц. К. партыі падтрымая Ц. Б. сэкцый матэр'яльна у меру патрэбы на будову партыйную і савецкую. Так сама Канфярэнцыя даручыла Ц. Б. выпрацаваць інструкцыю для тых партыйных працаунікоу, якія пасылаюцца сэкцыямі ля працы на Беларусь. Што належыць да дэклярацыйнае адозвы к беларускаму народу ад імяні Канфярэнцыі, та быу зацвержан яе тэкст, тэкст жа адозвы да беларусау-камуністау даручана націсаць Ц. Б. так сама як і тэкст аргумэнтацыі аб мабілізацыі усіх беларусау-камуністау, якую пастанавіла аб'явіць Канфярэнцыя.

Затрымаушыся яшчэ на некулькіх бягучых справах, Канфярэнцыя была зачыняна пад спеу Інтэрнацыяналу і Беларускае Марсэльезы.

Яшчэ доуга ня расходзіліся таварышы-дэлягаты—панавау пад'іом духу і моцная вера у беларускія камуніст'кія сілы...

Здоляям, адбудуям Савецкую Беларусь!

**Наз. Бываеускі.**

---

# Дарэмна, панове!

Дужа няпокояцца паны на Беларусі. Чырвоны знак «анархіі» усіо бліжэй і бліжэй насоуваяцца з усходу. Бяда блізіцца нямінучая, і паны кідаюцца ва усе бокі, стараючыся знайсьці сабе спасення. У заходніх часьцях этнаграфічна-беларускіх зямель яны з вялікаю надзеяю прагна глядзяць на адраджаючуюся шляхоцкую Польшчу і чакаюць адтуль сабе падтрымання. Ах, як добра было-б быць у Польшчы! Але Беларусь-та ня Польшча, і паны гэта добра ведаюць. І вось яны прыкладаюць усе старання, каб [illegible] на Польшчу. Яны зьбіраюць, гуртуюць абломкі дэмобілізованных легіонау Даубор-Мусьніцкаго і гатуюцца да захаплення Беларусі. Яны стараюцца узяць у свае рукі фармуямую міліцыю, каб пад яе постацю мець апору сваім анэксіоністкім намераниям. Адначасьня з гэтым яны ня забываюцца і аб душы народу, і вядуць процiу яе паход. Ім трэба стварыць фікцыю «народнаго голасу», каб апіраючыся на ім, пусьціць у ход згуртаваныя імі банды дзеля абароны «народных правоу на самаадзначэння». Паны арганізаваліся і ня шкадуюць грошы дзеля свае меты.

— Усіо роуна—думаюць яны — «хлопкі бялорускe» вернуць іх нам з лішкам. Але гэта посьля, а цяпер ня трэба скупіцца.— І паны сыплюць грашкі. Яны нанялі шмат агітатарау, якія ходзяць па віосках, палохаюць народ «большэвіцкімі зьверствамі» і намауляюць надаваць голас за прылучэння да Польшчы. Раздаюцца напісаныя у гэтум духу кніжачкі і лістоукі. Ня забыт імі і «косьцял», які заусягды быу гняздом польшчызны у нашум краю і верна служыу папска—польскім інтарэсам. Ксяндзы гавораць казання, у якіх страшаць сваіх парафіянау усімі мукамі пекла, калі толькі яны ня пададуць голасу за прылучэння да Польшчы. Пры гэтум ня абходзіцца і бяз яунаго шулярства. Як расказваюць прыезжыя, ксяндзы страшаць народ тым, што як прыйдуць бальшавікі, дык пазачыняюць касьціолы, паадбіраюць іконы і ня пазволяць навроду, выслауляць Бога. Так лішні раз пацьверждаяцца тоя, што вера усягды служыць імучым клясам проціу няімучых.

Гаворачы аб гэтых пробах бязстыднаго ашуканства народу, трэба мець на відавоку, што у межах старой аккупацыі, на захадзя Беларусі, асталася толькі каталіцкая люднасьць. Праваслауныя правя што усе выяхалі. Ну, а католікі заусягды мелі цягу да Польшчы і нпрыхільнасьць да Расеі, падаграваямую ксяндзамі, якім яны надта вераць. Грунт да полёнофільскае агітацыі там надта падатны. Тым радасняй кожнаму беларусу-сацыялісту чытаць, што у Віленскум павеця польскіх агітатарау «вельмі часта праганяюнь з віоскі». Так, у народа ужо адчыніліся вочы, і іон пачынае разьбірацца, хто друг і хто недруг яму, і ніякаю брахніою ня замажаця іх, панове! Дарэмна вашая праца! Тры годы з лішкам, праведзяныя народам пад уціскам нямецкаго боту і вашым,—адчынілі яму вочы. Іон покуль што маучыць, але зьбірая сілы, і як пачуя, што падмога блізіцца, возьмя за лапу вас і, як паганую жабу, выкіня вон с свайго краю.

**Павал Любецкій.**

---

# Адна с чародных задачау Радавае Беларусі.

Яшчэ у 1850 годзя у кніжачцы «L'Enseignement du peuple» Эдгар Кінэ (хранцускі сацыяліст) пісау: «Натта вялікую абмылку робяць тыя, хто разам з Монтэск'іо кажа, рэлігія прыпасоваяцца да палітычнага устрою гасударства; наадварот, палітычная сыстэма кіруяцца рэлігіяй. Бось дзеля чаго, калі рэлігія застаецца бяз зьмены, та і равалюцыі навет самыя [illegible], ня даюць ні[якае] карысці. Мартвая рэлігія нямінуча [illegible] тоя гасударства [illegible] народ, [illegible] застаюцца палітычна і арга[ні]часкі зьвязанымі з ею. Лібэральны каталіцызм ня больш, як хімера. Жозэф де Мэстр і Бональд далі нам разумення аб тым, што такоя істны каталіцызм, гатовы прыпасавацца да ускае палітычнае хвормы, абы толькі іон меу найбольшую вагу і панавання. Каталіцызм зьвязвая сябе з ваеннаю славаю Наполеона, з божаскім правам часау Растаурацыі (Вазстановы), с канстітуцыйным правам царствавання Людовіка-Піліпа, з распублікаю 1848 году. Хто можа паручыцца, што каталіцызм ня створыць якое-небудь новае хвормы прыгону у злучэнні с сацыялізмам?»

Гэтыя словы Кінэ можна прылажыць ня толькі да каталіцызму, але і у большуй мерцы да праваслау'я і наагул да кожнае гасударсцвянае рэлігіі, якая на крысе выраджаяцца у надклясавую установу, і духавенства становіцца як быццам саслоу'ям над саслоу'ямі. На працягу усяе гісторыі хрысціянства апошняя з рэлігіі па крысе перарабляласа ці у духоуны аутакрацізм ці сусім злучалася з гасударсцвянаю уласьцю. Хрысціянская цэркау і рэлігія пайшла с першых сталецціяу на двух розным напрамкам. На заходзя, дзе цэнтрам хрысціянства стау Рым, праз дзікасьць і нямоцную палітычнасьць новых гасударствау, зложаных на абломках старое Рымскае Імпэрыі у V—IX сталеццях, цэркау атрымала кіраунічую роль ва усіх нават палітычных справах. Каталіцкі папа, біскупы, кардыналі разам с сьветскімі князямі атрымалі у сваі рукі цэлыя княжства, чулі сябе натта моцнымі і прагліся паставіць сябе вышэй сьвэтскае уласьці. Барацьба між сьветскімі каралямі і князямі с аднаго боку і духоунымі з другога напауняя усю гісторыю аж да начатку XVII сталецця. Разам з гэтаю барацьбою за уласьць Рымская цэркау баролася і з грамадзянствам, з вольнаю думкаю; яна злосна сачыла за народам, за разумнейшымі людзьмі, пасылала паліць на агні кожнаго, хто адыходзіу у бок ці адважвауся ня быць у стасунку с пануючаю цэркау'ю. Трэба была рэлігійная равалюцыя XVI сталецьця, каб іншыя народы Заходняе Эуропы аслабаніліся ад гнятучаго валадарства цэрквы і пайшлі па дарозя навуковаго і грамадзянскаго развіцця. Толькі паудзіонна-заходнія гасударствы Эуропы засталіся пад поуным валадарствам каталіцызму і папства, кіруючых усім ня толькі духоуным але і палітычным жыццям гэтых гасударствау. Закладным прынцыпам каталіцтва з'яуляяцца духоуная аутакрацыя папы, духоуная валадарства яго і духовенства над усімі народамі.

На усходзя, дзе цывілізацыя была больш старою, дзе было шмат разных старых рэлігіяу і рэлігійных сектау, хрысьціянская духавенства ня мела такое значнае няравагі, ня мела стольки сілы, каб захапіць у сваі эдзіныя рукі і светскую і духоуную уласьць. Наадварот, тут яно прымушана было звярнуцца за падмогаю да візантійскіх імпэратарау, па крысе пярайшоушы пад поуную уласьць апошніх. Тут сьветская і духоуная уласьць злучыліся і пасабляі ад[на] а другой. Праваслауная духавенства Візанціі у сваіой угодлівасьці перад імпэратарамі зложыла дзеля вароду навучэння аб божаскуй уласьці цара, які мая праз гэта найвышэйшую поунасьць усіх духоуных і сьветс[кі]х правоу. Расея, атрымаушы праваслауная хрысьціянства ад Візанціі, пераняла усе ідэі і догмы апошняе разам з навучэннем аб божаскум пачатку уласьці цара. Такім способам, праваслау'я заусіоды падтрымлівала царскую гасударсьцвянуя уласьць, з'яуляючыся першым яго памошнікам. Дзеля умацавання царскае уласьці папоуства зацямняла розум народу, вяло барацьбу з вольным духам і думкаю і зацікауляно было у-трыманні народу у духоунуй цемры, як забеспячэнні дзеля панавання самадзержау'я і папства. **Дык вось усюды і на Заходзя і на Усходзя Цэркау і Рэлігія былі ворaжны да вольнасьці народу, усюды падтрымоувалі духоуны змрок, хоць і з рознымі мэтамі: на заходзя—дзеля валадарства над усімі народамі Ваціканy, на усходзя—дзеля панавання самадзэржау'я і пашырэння яго палітычнага валадарства.**

Беларусь праз гістарычныя варункі апынулася на рубяжу між каталіцтвам і праваслау'ям і стала арэнаю, на якой вялася аж да апошніх часау барацьба між абедзьвімі цэрквамі. Каталіцтва, у сваім пражэнні як мага больш пашырыць уласьць Рыму над народамі, бачыла у Расеі свайго едзінаго ворага і дамагалася скасаваць пры падмозя Польшчы, у часы яе валадарства Беларусю, праваслау'я. І наадварот, як толькі Беларусь адышла да Расеі, дык праваслауная папоуства, дбаючы аб пашырэнні гасударсьцвянае Расейскае Цэрквы, лічыла сваім зьлейшым ворагам ужо частваю умацованая на Беларусі каталіцтва і начало барацьбу з ім. У гэтуй барацьбе, якая ня прыпыняяцца і цяпер, ксяндзы і папы прагуцца прыцягнуць да сябе народ, знарочыста дзеляць яго, натрауляюць каталікоу на праваслауных і наадварот. Рэлігійная барацьба і зьвяртая перш усяго на сябе цікаупасьць, атцягаючы народ ад іншых пытанняу. Дзякуючы гэтаму цкаванню, гэтуй барацьбе, падтрымоуваяцца духоуная цемра, нясьвядомасьць у палітычных запытаннях, варажнасьць аднае часткі народу супроць другое. Больш таго, дзякуючы рэлігіі, і асабліва Цэркві і касьціолу, робіцца і палітычны падзел едзінаго беларускаго народу. Каталіцтва ідзе ад суседняе Польшчы, нясучы с сабою, апрыч веры, польскую мову і культуру. Праваслау'я ідучы з Маскоушчыны цягня с сабою расейскую мову і звычаі. Праз гэта бывая, што у адной сям'і іосць паляк і рускі, бо каталік стараяцца ужываць польскую мову, пнецца на шляхту і лічыць сябе паляком, а праваслауны чытая расейскія кніжкі (калі умея), хваліць усіо расейская і заве сябе расейцам. І такія здарэння, што у адной сям'і (нават бацька і дзеці) бываюнь рознае веры—ня у навіну на Беларусі. Жыцціо ужо у такой сям'і, ня кажучы аб цэлум народзя, як ката с сабакаю: варажнасьць, нязгоднасьць, сварка. Цкавання духоуных бацькоу сея толькі раздор між народам, падтрымоувая цемру пры той значнасьці, якую мелі яны да апошніх часау у жыцці нясьвядомаго забітаго беларуса.

Вось цяпер, калі Беларусь стала вольнаю, калі яна злучаяцца с сацыялістычнаю Расеяй, усем дзеячом сацыялізму у мэтах замацавання яго належыць прыкончыць гэтую рэлігійную, лепш кажучы, цэркоуную барацьбу, у краю. Трэба вырваць цёмныя нясьвядомыя аграмады беларускаго селянства з-пад валадарства папоуства і ксяндзоуства, якія уцягаюць яго у барацьбу паміж сабе і адвароча[]юць ад зацікауленасьці у саслоуных інтарэсах. Належыць замест старое рэлігіі і веры, падрымлівaушых валадарства паноу, залажыць іншую рэлігію, рэлігію вольнасці, працы, культуры. Гэтая рэлігія вядзе да аб'еднання, а ня падзелу усіх працоунікау, усіх былушых абяздоляных. Толькі такая рэлігія мая вартасьць перад чалавечым духам нашых часау.

«У нашы часы—казау Кінэ—уселсьветная хрысьціянства прагнецца выявіць сябе праз свабоду, роунасьць і братоунасьць, праз абажаст'уленне працы у грамадзянскіх установах; вось што завешча сацыялізмам навейшых людзей».

**Я. Петровіч.**

---

# Я люблю.

Я люблю, як гудзе стары бор,
Як дубы векавыя і хвоі,
[Завя]дуць свой глухі перабор
[І] гутараць—гудуць між сабою.

[Р]азасланы іх шат ад карон
[Па] зямлі гнецца туга, сярдзіта,
[П]адучы прывітанны уклон
[Н]эз'ясніонаю думкай навіты...

А [illegible]—навалы лецяць
[illegible] з большай і большаю сілай,
[illegible] іх нічаму ня стрымаць
[illegible]ушым у цямні небасхілам

[Я]ны родзяць свой гуд і жануць
[illegible] стрымоуваным нудлівым узгонам,
[illegible] расуць усе вакол ды гудуць
[illegible] прызыуныя гучныя звоны.

[illegible]ржыць, здаецца, земля
[illegible] песьні стыхійнай напору:
[illegible], яшчэ міг, і уся
[illegible]ня у бяздонная мора...

Я люблю, як гудзе стары бор—
[illegible] песьні яго растаю я,
[illegible] мне [illegible] ціхі навор
[П]рад злым і ліхім, і гатую
[illegible] барбу вакавую.

[illegible]

---

# У час барацьбы.

Адзень, дух майго народу, чыстую ясную апратку прауды і хараства.

Прыбяры сябе у ясныя праменьня творчаго быту.

Узлажы на вякамі пакорную голаву сваю вянок вольных думак-песянь і вітай вялікі час барацьбы.

Час уваскрэшэння чалавечаго „я“!

Час панства пакрыуджаных і бяздольных!

Час трыумфу мазольных рук!

Час—шлях к зорам хараства!

Шлях к прасветламу сонейку справядлівасьці!

Так доуга скуты у няволі, у кайданах, вастрогах, снягах, Сыбіру, сырых падвалах, халодных мансардах, у холадзе і голадзе міліонамі гарачых сэрцау з болям і маркотнасьцю. Час новаго чалавечаго быту...

Час апошняй барацьбы за гэты быт!

Вітай яго пяклом крыві пяралоуненых радасьцю сэрцау наших, што у парычыя крыку. „Потанка“! топяць сковы тугі і гора жыцця.

Гэты вялікі час!

Вітай яго чарадою зорных надзей, што клічуць цябе, зганьбяны дух чалавечы, к [illegible] гармоніі быту.

[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Час уселсьветнаго сьвята дзяцей працы
Сьвятой працы!
Крэдо быту народау!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

З ваяунічымі зыкамі, што запоуняць абшар сьвету.

З роямі манау-дум, што выкавалі мукі няволі.

Дух майго народу!

Шыбай арлiным палiотам к пурпураваму праменню зарава барацьбы.

Страшнай ракавой барацьбы на смерць і жыццё!

Ты, сірата, нашоу сягоння раднаго і сагрэйшся на яго утульных пылаючых полымям грудзях...

Святы час!
Магутны час!
Будзь ты нам!!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Прабудзеныся крывіцкія лугі, лясы, балоты, палі!

Вузенькія загончыкі, што корміце сьвет!

Шэрыя родныя вёскі!

Вёскі, як раны пакуты, кінутыя бязлітаснай рукой кону сярод пяскоу, імшарау і лоз!..

Забытыя людзьмі і доляй родныя вёскі!..

Бацька народ мой гаротны!

Народ ярма і вякавога цярпення!

[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Кайданоу!
Што акулі тваю думку!
Разум!
Душу!
Час новаго быту!

Час вялікай барацьбы з крыважэрчым груганнём...

Што вякамі смокчуць тваю кроу!
Твой пот!..
Твае сьлёзы!..
Груганнем—што завеш „панамі“...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Прыдзіця, народныя песняры і трыбуны.

Сыны вялікаго і убогаго народу.

Што так многа носіць у сабе усевалодных песянь і слоу.

Распаляцця вашы сэрцы полымям барацьбы.

Развярнецця вашы душы сьпевам пабеднаго трыумфу.

Дабудзця з прадвечных тайнікоу свайго „я“ магутныя:

Словы—прызыу!
Песьню—пажару душ!
Куйця імі новую долю!
Шлях к сонцу!
Радасьць барацьбы!
Складайця новыя і новыя гімны!
Пейця!
Клічця!

[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Каваць волю!
Шчасьця!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Складайцяся зыкі доуга хаваныя у сэрцах народау у адзін вялікі васкрэсны харал!..

Ціха, смутак!
Змоукні жаль!
Радасьць сягодня вялікая!

Радасьць глыбі быту у прасторы сонцаяснай волі.

Радасьць адзінокіх забытых душ, што блудзілі у цемры бяздарожжа...

У цемры чорнай нясьвядомасьці.

Будзь нам новы шлях быту!

Шлях барацьбы!

Вядучы да заснутай лятуценнямі касцэ-праудзя.

К крыніцы жыватворнай вадою...

Зыдзіця, ланцугі!

Сплывецця мглівыя сырыя туманы.

Што труцілі народ ядам пакоры!..

Кліч бунту жыві у нашых сэрцах!

Святы кліч гардасьці чалавечай!

Што імчыць чалавечая „я“ у высь у палёця арла!..

Кліч барацьбы будзь нам:
Хлебам штодзённым!
Сілай няпакананай надзеі!
Час вялікай барацьбы, благаслауляям цябе!
Благаслауляям!!

*Фабіян Шантыр.*

1918 [illegible]

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# К белорусскому трудовому народу.

## Товарищи—братья белоруссы!

Вы, целые века стонавшие под батогами польских и литовских королей, под казацкими нагайками русского самодержавия, вы, по земле которых прошел всеразрушающий молох ужасной войны, бросивший миллионы беженцев, испестривших могилами своих отцов, матерей, жен и детей все необ'ятное пространство России, вы, бедные сыны обездоленной матери Белоруссии, слушайте:

Настал час воскресения белорусского трудового народа; усилием рабочих и крестьян повергнуто в прах русское самодержавие; за ними следом покатились короны других царей и королей: волей немецкого народа свергнут мировой тиран, многоголовый спрут, душивший стальными тисками свой и соседние народы,—Вильгельм кровавый; приходит очередь и на остальных кровопийц „помазанников божьих".

Народы прозрели, поняли куда ведут их кровавые куклы в коронах, что готовят им прихвостни королей, паны и духовенство, лизоблюды и пресмыкающиеся гады—продажное чиновничество, и явившиеся им на помочь социал-предатели.

Народы, покончив с поработителями, сразу же перешли к самой простой и в то же время честной, неподкупной, основанной на единой воле народной, власти: Советам рабочих, крестьянских, и солдатских депутатов; ибо Советы, только они, дадут рабочему справедливую оплату труда, крестьянину землю. Они только приведут человечество к светлому идеалу социализма, великой трудовой пролетарской коммуне. Они одни удержат в своих честных руках красное знамя труда, знамя пролетарского освобождения, знамя торжества и победы над проклятым капиталом и произволом,—только в Советах бьется подлинное сердце народное, только Советы избранные из лучших сынов трудового народа радуются его радостью, плачут его слезами.

Но насколько Советы милы и дороги сердцу пролетарии, сердцу бедного рабочего и крестьянина, настолько они ненавистны всем цеплявшимся и цепляющимся за старую неограниченную власть; всем панам и духовенству, кровопийцам помещикам, мироедам купцам, всем, кто на кровавом поте трудовой бедноты строил свое благосостояние, кто хочет жить чужим трудом, жиреть как клоп от народной крови. Не милы Советы и всем тем „социалистам" из лагеря соглашателей, кои зовут Вас жить в согласии со всеми этими врагами трудового народа.

И вот теперь, когда усилием народным прекращена всемирная война—эта бойня, вырвавшая миллионы юных жизней, сынов трудового народа, стоившая сотни миллиардов народных денег, когда, казалось бы, рабочий может опять приступить к станку а крестьянин-земледелец—спокойно пахать землю; когда на страже пролетарских интересов становятся советы, откуда на весь мир слышен подлинный голос трудового народа с призывом к диктатуре пролетариата, а через нее к всемирному интернациональному об'единению трудящихся, — вчерашние радители за страждующее человечество, „просвещенные" правители запада, а с ними все прихвостни старого строя, опекавшие народ кнутом, тюрьмами и лживыми толкованиями евангельских заветов—все эти негодяи об'единились под сладкие напевы социал-соглашателей, чтобы опять затянуть глухую петлю на шею освободившагося пролетария рабочего, на шею бедного крестьянина.

